## № 39. Ганьне Бабарэцы

*7/II–1931 г.*

Дарагая, любая мая Анечка!

Адсылаю пару бялізны, шэрую рубашку, пару шкарпэтак, хустачку і пасуду: дзьве каструлі, кубак, пляшку.

Я здароў. Адчуваюся бадзёрым. Рад, што табе памагае Ігнась. Моцна яго за гэта дзякую. Добра, любая, дзяцей адпраўляй з мамаю на вёску. Глядзі, любая, сябе, каб здарова была. Ці прынялася ў вас воспа?

Шчыра і моцна дзякую за сёньнешнюю перадачу. У наступны раз прынясі ручнік і прасьціню. Адсылаю штаны, іх трэба залапіць, бо працёрліся.

Моцна–моцна цалую вас усіх. Вітай Ігнася.

Ваш *Адам*.

Ліста твайго не атрымаў.

Пашлю табе ліст 10/II.

## № 40. Ганьне Бабарэцы

*21/II–1931 г.*

Дарагая мая, любая Анечка!

Адсылаю пару бялізны, тры пары шкарпэтак, хустачку, наўлачку, ручнік, торбу, каструлі і бутэльку.

Твайго ліста я яшчэ не атрымаў. Табе паслаў учора паштоўку.

Любая, папраў мае шэрыя старыя штаны і прышлі іх мне. Рубашкі яшчэ ня шый. Туфлі прышлі праз тыдняў са два. Пакуль што чаравікі яшчэ паносяцца.

Я здароў, жыву думкамі пра Вас. Глядзеце сябе, каб жывы былі і здаровы. Ці прынялася ў Вас воспа?

Перадачу сёньнешнюю атрымаў. Моцна–моцна дзякую, любыя мае і дарагія дзетанькі.

У наступны раз сарочкі не прынасі, а толькі кальсоны. Сарочкі ў мяне ёсьць яшчэ чыстыя.

Моцна–моцна цалую Вас усіх, любыя мае.

Ваш *Адам*.

## № 41. Ганьне Бабарэцы

*14/III–1931*

Дарагая любая мая Анечка!

Адсылаю пару бялізны, дзьве пары шкарпэтак, прасьціню, ручнікі, наўлачку, хустачку, торбу і пляшку.

Я здароў. Адчуваюся бадзёра. Рад за дзяцей і Вас, што здаровы. Мне яды хватае. Многа ня прынось. Я яшчэ ня зьеў таго, што прошлы раз прынесла.

Любыя мае, шануйцеся, каб здаровы былі, і ўсё будзе добра. Кніг мне пакуль што ня трэба. Перакладаю тое, што ты прыслала. Адзежы таксама ня трэба.

Шчыра і моцна дзякую за сёньнешнюю перадачу. Моцна–моцна цалую Вас усіх.
11 сакавіка я паслаў табе ліст, ці атрымала ты?
Твайго я яшчэ не атрымаў.
Моцна–моцна цалую сваіх слаўных любчыкаў.

Ваш *Адам*.

## № 42. Ганьне, Элеаноры, Алесі і Анастасіі Бабарэкам

*10 красавіка 1931 г.*

Дарагая любая мая Анечка!

Слаўныя мае любеняткі, дарагія дзетанькі Лорачка і Лялячка! Дарагая мама!

Вам я паслаў 1/IV ліст, і 1/IV–ж пасьля таго, як ужо здаў ліст, прынесьлі мне ліст ад Вас. Гэта быў той ліст, які ты, Анечка, пісала ў другі раз. Каб ведалі вы, мае даражэнькія, як парадаваў мяне гэты ліст. От так усё як жывое паўстала перад вачыма і горка стала, што маім любеняткам давялося так мерзнуць і так перацерпець і холаду, і недаяданьня. А колькі клопату ўжылі Вы, мае родненькія! Добра, любая, што хаця ўдалося табе справіць і сабе, і дзецям абутак. От шкада толькі, што табе ніяк не ўдаецца справіць новага зімовага паліто. Бедная мая ты, Анечка, як ты і вытрывала гэту такую жорсткую зіму? То–ж і паліто ў цябе ветрам падбітае: і старое, і летнае. Любая мая, як–небудзь мяркуй так, каб набыць сабе паліто на наступны год. Гэта–ж далей так немагчыма быць.

Слаўнымі сваімі дзеткамі я рад надзвычайна. Рана ім давялося гора зазнаць. Затое, думаю, большаю будзе радасьць пазьней, як вырастуць здаровыя, моцныя і загартаваныя. Лорачкіны малюнкі мне вельмі падабаюцца. Вучыся, любенькая Лорачка, і будзеш некалі вялікія малюнкі тварыць. Тата рад тваім малюнкам. Тата рад, што вы, мае слаўныя дзетанькі, не забываеце яго і любіце яго. Тата вас таксама моцна–моцна любіць, і як пусьцяць, ён зноў прыдзе да вас, будзе з вамі гуляць, будзе вам байкі баяць і казкі казаць, будзе вам песенькі сьпяваць. А многа баек ён знае, многа і песень умее. І будзем разам працаваць і радавацца жыцьцю.

От так у думках пра Вас, родныя любыя мае, і перажываю гэты цяжкі для нас час, нечаканы й незаслужоны. Вы мне, дарагія, дадаеце сілы ўсё перабываць і перажываць лёгка і бязбольна. У вялікай надзеі быць зноў з вамі разам і пераконанасьці ў хуткім прыходзе гэтае часіны я ніколі не смуткаваў, ня падаў духам і не ўпадаў настроем. Як на дзіва, настроем я бадзёры ўвесь час, і песьні з маіх вуснаў амаль ніколі ня сходзяць. І радасна пад іх рытмы думаць пра вас, і тады заключэньне здаецца толькі сном.

Што да пражытку, то вельмі і вельмі Вам узьдзячны за падтрыманьне. Яно толькі ўвесь час мяне непакоіць тым, што вы гэта ад сябе ўрываеце, а несяце мне. Любая Анечка, не рабі гэтага. Глядзі лепш дзяцей. Ты–ж ведаеш, як можа адбіцца на іх недаяданьне, а я па ўсім бачу, што Вам з харчамі трудна. Ты–ж яшчэ да гэтага адбіраеш ад сябе для мяне. І апошнім часам шчэ стала так многа перадаваць, што я й не зьядаю. Мне, любая, трэба ня многа — калі прынясеш кусок хлеба да гародніны якое, я буду тым і здаволен. Калі–ж дастаеш які кусок масла ці сала — пакідай яго для дзяцей і сябе. Я пераконан, што ты сама за гэту зіму страшэнна пахудзела і выглядаеш няважна. Столькі клопату ты ужываеш, а харчуешся як папала. От–жа калі ты сябе не даглядаеш, то гэтым самым робіш праступак і перад сабою, і перад намі ўсімі. Не забывайся, што ты цяпер для ўсіх нас маці. Дык–жа шануй свае сілы і здароўе. Як кончацца заняткі ў школе, едзь, любая, у вёску адпачыць. Пра мяне не турбуйся. Усё будзе добра.